ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 148 | ЧАЦЬВЕР, 29 чэрвеня 1933 г. | № 148

ЯШЧЭ АДНА ПЕРАМОГА, АТРЫМАНАЯ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ.

Новаму атраду маладых байцоў на фронце культурнай рэвалюцыі, выпускнікам пэдінстытуту, Белпэдтэхнікуму, пэдрабфаку, яўпэдтэхнікуму—бальшавіцкае прывітаньне.

Вядучы пад кіраўніцтвам партыі і яе правадыра т. в. СТАЛІНА разгорнуты наступ па ўсім фронце, у вострай клясавай барацьбе з рэшткамі капіталізму ў эканоміцы і псыхалёгіі людзей, новыя кадры, узброеныя тэорыяй Маркса—Леніна—Сталіна з усёй бальшавіцкай рашучасьцю будуць весьці барацьбу за партыйнасьць у навуцы, за камуністычнае выхаваньне новага пакаленьня і перавыхаваньне шырокіх працоўных мас за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Новыя кадры павінны па бальшавіцку змагацца за поўнае выкананьне гістарычнай пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе, за поўнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі.

Гарком КП(б)Б.

Гарадзкі камітэт ЛКСМБ вітае пралетарскае студэнцтва, адміністрацыю, прафэсарска-выкладчыцкі пэрсанал пэдінстытуту, Белпэдтэхнікуму, яўпэдтэхнікуму і пэдрабфаку з чарговым выпускам новага атраду барацьбітоў за камуністычнае выхаваньне падрастаючага пакаленьня, закліканы па-баявому змагацца за далейшыя перамогі ў рэалізацыі гістарычнага рашэньня ЦК УсеКП(б) аб школе, змагацца за партыйнасьць у навуцы, атрад прызваны сваёй работай несьці ў масы рабочых і калгасьнікаў вучэньне Маркса—Леніна—Сталіна.

Гэты выпуск ёсьць яшчэ адна перамога, атрыманая пад кіраўніцтвам ленінскай партыі на фронце будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

Ударнікі перадавых навучальных устан Віцебску, змагаючыся за пяршынства ва ў саюзным спаборніцтве ВНУ і тэхнікумаў, ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых парты і ўрадам у галіне павышэньня якасьці ра ты ВНУ і тэхнікумаў, за якасьць падрыхто пралетарскіх спэцыялістаў,—па праву могу ганарыцца гэтай перамогай. Але была-б не бальшавіцку сьцвярджаць, што ўсё зроблен Мы зрабілі першыя крокі ў ажыцьцяўлен гэтых задач, упередзе яшчэ вялікі шлях барацьбы за рэалізацыю пастаноў партыі і ў ду па ўсіх зьвеньнях устаноў, што рыхтую кадры для сацыялістычнага будаўніцтва.

Дык за спр-ву-ж, таварышы!

Гарком ЛКСМБ.

Смаленск, абкампарт—Румянцаву. Аблвыканком—Ракітаву.

Шлем бальшавіцкае прывітаньне партыйнай і камсамольскай арганізацыі, калгасьнікам і ўсім працоўным Заходняй вобласьці. Сацыялістычнае спаборніцтва паміж БССР і Заходняй вобласьцю зьявілася мацнейшым вагаром у барацьбе за тэмпы і якасьць у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы.

Ня гледзячы на тое, што за БССР у спаборніцтве па сяўбе з Заходняй вобласьцю засталося пяршынства і яна закончыла ў гэтым годзе сяўбу на 20 дзён раней мінулага году, адзначаем, што мы далёка ня вытрымалі ўстаноўленых партыяй і ўрадам тэрмінаў сяўбы як па ўсіх культурах у цэлым, так і асабліва па аўсу і ільну.

Партарганізацыі, саветы, калгасьнікі Заходняй вобласьці паказалі прыклад сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за своечасовае сканчэньне пасеваў ільну, апярэдзіўшы БССР.

Прымаем вашу прапанову аб прадаўжэньні дагавору па сасцпаборніцтву за пяршынства ва ўборцы новага ўраджаю і першачарговым датэрміновым выкананьні абавязацельстваў перад дзяржавай, за ажыцьцяўленьне лёзунгу праваднра нашай партыі тав. Сталіна—зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгасьнікаў заможнымі.

Абавязацельствы, якія выцякаюць з прадаўжэньні дагавору, ставім на шырокае абмеркаваньне. Мабілізуем кожны саўгас, калгас, сельсавет, працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за сацыялістычнае пяршынства.

Сэкратар ЦК КП(б)Б Гікало.
Старшыня СНК БССР Галадзед.

УДАР—ПА ДРОБНАБУРЖУАЗНАЙ РАСПУШЧАНАСЬЦІ!

Адной з сур'ёзных прычын нашых прарываў у пасеўнай кампаніі і на іншых вучастках гаспадарчай і партыйнай работы зьяўляецца досыць моцна ўкараніўшаяся ў пэўных колах актыву партарганізацыі недысцыплінаванасьць, бездаказнасьць, дробнабуржуазная распушчанасьць пры гніла лібэральных адносінах да гэтага кіраўніцтва партарганізацыі.

ЦК КП(б)Б неаднакроць завайстраў увагу нашай арганізацыі і гаркому партыі на неабходнасьць самай жорсткай, самай бязьлітаснай барацьбы за бальшавіцкую дысцыпліна ванасьць, супроць расхлябанасьці і кіселяпадобнасьці. Досыць успомніць даклад тав. Гікало на сходзе актыву, прысьвечаным падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, даклад тав. Шаранговіча таксама на сходзе актыву аб чыстцы партыі і ходзе пасеўнай, яго тэлеграму аб прарывах у пасеўнай на Віцебшчыне, даклад тав. Жаброўскага на нарадзе праверкомаў і сэкратароў ячэек аб папярэдніх выніках чысткі ячэек першай чаргі. Ва ўсіх паказаньнях ЦК і выступленьнях яго сэкратароў, адрасаваных віцебскай партарганізацыі, пытаньне аб неабходнасьці асаблівага завайстрэньня барацьбы з бездаказнасьцю і недысцыплінаванасьцю ставілася як адна з важнейшых задач нашай партарганізацыі ў барацьбе за выкананьне гаспадарча-палітычных заданьняў партыі і ўраду.

А між тым, гэтыя паказьніні і патрабаваньні ЦК ня былі ўлічаны і падхоплены.

Пачнем з партузносаў. Безалабэрнасьць, распушчанасьць, праўленыя значнай часткай бюро парт'ячэек прывялі да неймаверчай запазычанасьці па членскіх узносах—першай адзнакі адсутнасьці неабходнага ўзроўню партдысцыпліны. І зараз, пасьля сыгналаў «Правды», пасьля таго, як падрыхтоўка да чысткі партыі вы крыла гэта становішча, знаходзяцца людзі, якія у сваёй «старанасьці» выправіць тое, што упускалася на працягу доўгага часу, пачынаюць без разбору адсякаць ад партыі ўсіх, хто, з-за створанай самімі гэтымі людзьмі атмасфэры бездаказнасьці, аказаўся ў ліку запазычнікаў па членскіх узносах.

Зразумела, кожны камуніст нясе поўную адказнасьць за свае паводзіны, але ў першую чаргу трэба прыцягнуць да адказнасьці тых кіраўнікоў партыйнай масы, той актыў, які закліканы ажыцьцяўляць выхаваньне масы, уняраньне ў яе разуменьня сутнасьці бальшавіцкай партыйнасьці.

Але далёка незаўсёды так ставілася пытаньне ў нашай практыцы. Усім памятна выступленьне „Правды" аб „мёртвых душах" у віцебскай партарганізацыі. Трэ' было пасьля гэтага чакаць, што будуць выкрыты сапраўдныя віноўнікі такога значнага адсеву партыйцаў ад партыйнага жыцьця, што яны атрымаюць моцны вурок таго, як партыя патрабуе ад кожнага сэкратэра ячэйкі чулага і ўважлівага падыходу да кожнага партыйца, веданьня кожнага партыйца, бальшавіцкага выхаваньня яго. Аднак, прэзыдыум кантрольнай камісіі пашоў па лініі найменшага супраціўленьня: ён абвясьціў аб выклiку на пасяджэньне парткалегіі ўсіх „страчаных" партыйцаў і паколькі, зразумела, яны на выклік не зьявіліся, паслаў у рэдакцыю для апублікаваньня сьпіс «выключаных з партыі за бяўку ў парткалегію».

Наведваньне партсходаў—важнейшы абавязак партыйца. На партсходзе партыйцы вырашаюць пытаньні партыйнай работы, праз партсход кожны партыец тысячамі ніцей зьвязваецца з партыяй, удзельнічае ў жыцьці яе, у яе барацьбе за сваю генэральную лінію. У нас жа зрыў партсходаў, альбо вельмі неакуратнае іх наведваньне—зьявішча занадта частае. Мы мелі, нават, зрывы сходаў па чыстцы ячэек («Чырвоны металіст», пошта, Белгандаль, лесавод)

Толькі бездаказнасьцю і расхлябанасьцю пэўнай часткі актыву тлумачыцца гэтыя зьявішчы. Вось, да прыкладу, сэкратары ячэек тт. Хадарэнка, Берасьцень, Магергут, Баранава, Дыкман, Захарэвіч, Вульфовіч, Левіт і Камень, не адчуваючы са сабой ніякай адказнасьці, ні якіх абавязкаў, знаходзяць для сабе магчымым уйсьці з нарады сэкратароў ячэек, на якой вырашаліся важнейшыя пытаньні бягучай работы партарганізацыі. Як жа яны думаюць кіраваць гэтай работай у сябе у ячэйцы? І якжа яны могуць устанаўліваць і ўмацоўваць партдысцыпліну у сваіх ячэйках, калі ў іх саміх няма самых мінімальных навыкаў дысцыплінаванасьці?

Альбо вось, для характарыстыкі, адносіны некаторых „актывістаў" (калі іх так можна назваць) да партыйнага сходу. Успомнім партсход на шчацінным камбінаце, прысьвечаны распрацоўцы пастановы ЦК УсеКП(б) „Аб рабоце палітаддзелаў МТС, аб калгаснай ячэйцы і аб узаемаадносінах палітаддзелаў і райкомаў". Расхлябанасьць і дэзарганізаванасьць, дрэннае абвяшчэньне і вялікае спазьненьне пачатку сходу, самая нізкая актыўнасьць і адсутнасьць адпору яўна-антыпартыйнай вылазцы, меўшай месца на гэтым сходзе, бязтурботнасьць, дайшоўшая да таго, што „забыліся" напісаць рэзалюцыю—усё гэта ярка выяўляе дробнабуржуазную распушчанасьць бюро калектыву і, у першую чаргу, т. Палатоўскага, які непасрэдна павінен быў забясьпечыць посьпех сходу. Больш таго, распушчанасьць дайшла да таго, што ў час партсходу група рабочых, у тым ліку і камуністаў, была патаемна ад сэкратароў цэхячэек застаўлена на звыштэрміновай рабоце (аразумела, без дазволу адпаведных органаў улады).

Самавольныя раз'езды актыву па справах і бяз спраў—гэта яркая праява распушчанасьці і недысцыплінаванасьці—у Віцебскай партарганізацыі зьявішча далёка не адзінкавае.

Але для зрыву партзаданьня, аказваецца, зусім неабавязкова ўежджаць з гораду. Т. Прусьлін (ячэйка саўпартшколы) палічыў магчымым сарваць сход жонак рабочых, жыхарствуючых у жактах, так сабе—«за здарова жывешь».

Чоткае і дакладнае выкананьне партыйных даручэньняў і пастаноў—гэта-жа аснова бальшавіцкай дысцыпліны, без чаго нямысьліма партыя, ня мысьліма яе барацьба, ня мысьліма яе перамогі. А тав. Гіцовіч—старшыня ЦРК, атрымаўшы тэрміновае даручэньне гаркому, выпякаючае з задачы забясьпечыць выкананьне экспартнага пляну фабрыкай гнутай мэблі, лічыць для сябе магчымым пусьціцца ў разважаньні: а ці варта гэтае даручэньне выконваць. І, рашыўшы для сабе, што ня варта, нікога не паведаміўшы, ні перад кім не аспрэчыўшы зьдзеньня, ня выканаў яго.

Рашэньне партыі—гэта баявы загад. Мы вядзем бойку, і жорсткую бойку, і ўсялякае самачынства, малейшая расхлябанасьць, малейшая недысцыплінаванасьць, раскрывае той альбо іншы вучастак для ворага, паслабляе той, альбо іншы вучастак нашага фронту. „Хто хоць колькі-небудзь паслабляе жалезную дысцыпліну партыі пралетарыяту (асабліва ў часе яго дыктатуры), той фактычна дапамагае буржуазіі супроць пралетарыяту" (Ленін).

Дробныя на першы погляд парушэньні партдысцыпліны (няўплата членскіх узносаў, зрыў партсходаў, самавольныя від'езды, невыкананьне асобных апэрацыйных рашэньняў), застаючыся без рэагаваньня, застаючыся без пакараньня, пачынаюць расьці і ўзмацняцца, прывіваецца ва ўсіх галінах работы, перарастаць у моцныя ўдары па партыйнай рабоце, параджаюць прарывы. Гніла-лібэральная адносіны з боку партыйнага кіраўніцтва да парушыцеляў партдысцыпліны ў паасобных выпадках бягучай работы, адсутнасьць кантролю выкананьня (які Ленін назваў гваздом усёй нашай работы) і прывялі да ўзмацненьня дробнабуржуазнай распушчанасьці часткі актыву нашай арганізацыі. Парушэньне ўстаноўленых партыяй і ўрадам плянаў і тэрмінаў стала звычайным зьявішчам на радзе вучасткаў нашай работы.

З гэтай дробна-буржуазнай распушчанасьцю трэба пакончыць адразу, моцна і рашуча, раз назаўсёды. Праходзячая зараз чыстка партарганізацыі павінна будзе ачысьціць яе ад адкрытых і скрытых парушальнікаў „жалезнай дысцыпліны партыі і дзяржавы, якія ня выконваюць пастаноў партыі і ўраду, бяруць пад сумненьне і дыскрыдытуюць рашэньні і ўстаноўленыя партыяй пляны балбатнёй аб іх нерэальнасьці і неажыцьцявімасьці", павінна ўзмацніць дысцыплінаванасьць усёй арганізацыі, кожнага яе члена, і актыву ў першую чаргу.

Разьбіць гнілы лібэралізм, жорстка, па ленінскі ўмацоўваць партдысцыпліну, «каб лёзунг дыктатуры пралетарыяту не апаганьваўся практыкай кіселяпадобнага становішча пралетарскай улады" (Ленін, 3 выд. т. XXII, стар. 453)—адна з важнейшых задач Віцебскай парт-арганізацыі ў яе барацьбе з прарывамі, у яе барацьбе за заняцьцё аднаго з перадавых месц у КП(б)Б.

НАПЯРЭДАДНІ УСЕБЕЛАРУСКАГА І РАЁННАГА ЗЬЛЁТАЎ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

КОЖНЫ КАЛГАС ПАВІНЕН ЗМАГАЦЦА ЗА ПРАВА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ЗЬЛЁЦЕ ПЕРАДАВЫХ.

СТАРАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ ГАНЕБНА АДСТАЕ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗЬЛЁТУ.

„Спаборнічаць так, каб дабіцца агульнага ўздыму".

Ліст калгасьнікаў Рудніцкага сельсавету да калгасьнікаў і калгасьніц Сялюцкага сельсавету.

Да вас, нашы суседзіі калгасы, разьмешчаныя на тэрыторыі суседняга Сялюцкага сельсавету, зварочваемся мы з лістом, у якім жадаем расказаць чаму мы праваліли веснавую сяўбу, якое наша становішча зараз і што мы—гаспадары нашых калгасаў, гаспадары нашага жыцьця мяркуем зрабіць для таго, каб уровеі сяўбы ўлічыць і каб не дапусьціць такога-ж становішча на працоўцы і па ўборцы.

Нам, калгасьнікам Рудніцкага сельсавету, дзяржава дала плян сяўбы на 3.029 гэктараў, а мы недасеялі больш 200 гэктараў. Вось чаму мы і гаворым, што мы праваліли сяўбу. Яшчэ горшым было-б наша становішча, калі-б нам вы і дзяржава не дапамаглі. Мы так запягнулі і так ганебна праваліли работу ў маі—у месяцы, калі патрэбна было скончыць сяўбу—што калі-б ня тая рабочая цягавая сіла, якую вы нам прадставілі ў якасьці буксіру, калі-б ня тое насеньне, якім нам дапамагла дзяржава і вы, калі-б не трактары МТС—мы бясспрэчна зусім праваліл-б сяўбу, гэтым самым ня выканалі сваіх абавязкаў перад дзяржавай і пусьцілі б саміх сябе на галоднае жыцьцё.

У нашыя справы ўмяшалася моцна партыя, моцна мы адчуваем наколькі рэальнай і вялікай дапамогай адгукнуліся вы, сялюцкія калгасьнікі. Тысячы працадзён зарабілі вашы калгасьнікі ў калгасах нашага савету. Добра працавалі вашы калгасьнікі. Ударна працавалі вашы буксіраўцы. Ні адзін з іх на меў менш чым 1,3 працадні. Сваім прыкладам яны падцягвалі нас і вось за работу такіх дзесяткаў людзей як Ляпёшкін з калгасу „Зьвязда", як Канаплёў з калгасу «МОПР», як Восіпавы і Разумоўскія мы вам шлем наша цёплае братэрскае калгаснае дзякуй. Вы нам дапамаглі насеннымі фондамі і гэта разам з той вялікай дапамогай, якую мы атрымалі ад дзяржавы, дала магчымасьць нам абсемяніць амаль увесь яравы клін.

Наша дзяржава нам пазычыла больш за 2.000 пудоў насеньня. На 50 гэктараў мы атрымалі ад дзяржавы сілосных культур і больш чым на 150—ільнанасеньня. Наша віцебская МТС нам дапамагла трактарамі, якія ў агуле апрацавалі 100 га. І вось ў нас, а мы ўпэўнены і ў вас, зьяўляецца думка, чаму мы, рудніцкія калгасьнікі і калгасьніцы, апынуліся ў такім становішчы?

Таму, што кулацкія сабатажнікам—свалачам, гадам нашага жыцьця і дабрабыту ў нашым сельсавеце была дадзена намі ж поўная магчымасьць дзейнічаць. У вас засталіся незакранутымі страхавыя насенныя фонды, а ў вас нават ня былі засыпаны насенныя фонды, у адным калгасе імя Дзяржынскага згнаілі да 3-х тысяч пудоў бульбы. Кое-дзе ў калгасы папабралі людзей, разбазарыўшых сваю маёмасьць і насенныя фонды. У нас у радзе месц давялі справу да таго, што пачыналі сяўбу з поўным намерам яе сарваць, яе не закончыць.

Шкоднік Сьпірыдонаў, будучы старшынёй калгасу „Бальшавік", яўна работаў на тое, каб зрабіць калгас не бальшавіцкім. У яго знайшліся нашы калгасныя грошы для таго, каб сабе набыць сеці для рыбнай лоўлі і спэкуляцыі рыбай, а ніводнага гроша ня было адпушчана на падрыхтоўку гародніны. Больш чым у іншых сельсаветах і калгасах мы разам з кулацкімі сабатажнікамі хныкалі аб сырасьці, аб немагчымасьці сеяць, а ў той-жа час незаўважанымі засталіся дзеяньні Клубнікава Рыгора і Аляшкоўскага Палінэра, якія замест таго, каб мяшаць глебу пад бульбу, узялі калгасную бульбу і тут-жа на полі яе варылі. І гэта называецца працадысцыпліна; і гэта называецца барацьба за працадні!

Мы правалілі сяўбу таму, што не наладжана ў нас і нават і дагэтуль працоўная дысцыпліна.

Кулацкая ўраўнілаўка—вось асноўны біч—біч нашага калгаснага жыцьця. Нярэдкі выпадкі ў нашых калгасах, калі лістаносец, знаходзячыся ў 2—3 кілёмэтрах ад паштовага агенцтва, зарабляе больш, чым добры сявец. А разбазарваньне працадзён у нас самае звычайнае зьявішча. Паглядзець толькі ў працоўныя кніжкі калгасьнікаў у любым калгасе. Там так і стракацяць: „Хадзіў у горад", „розныя работы". І пад гэтымі рознымі работамі, пад кулацкай ураўнілаўкай скрываецца гультай і прагульшчык. У калгасе «Новае жыцьцё» у час усёй веснавой сяўбы на розныя работы прыпадае больш працадзён, чым на палявыя. Там умудрыліся ў невялічкім калгасе мець вызваленага старшыню; рахункавода, брыгадзіра і нават поўбрыгадзіра. У калгасе імя Мархлеўскага былы старшыня Занкавіч Антон, будучы ўжо радавым калгасьнікам, з 43-х працадзён зарабіў 15-75 за тое, што езьдзіў і хадзіў у горад, а навошта і што зрабіў—гэта «шыта крыта». А мы ведаем, аб гэтым нам гаварылі вашы калгасьнікі, што ў вас працадзень вялікая сіла, што ім абы-як ня кідаюцца.

Становіцца зразумелым, што ня было, па сутнасьці кажучы, у нас разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва. Яшчэ ў канцы зімы калгас імя Дзяржынскага выклікаў на спаборніцтва калгас імя Ланцуцкага, але справа далей выклiку не пайшла.

Ворыва папару ідзе ў нас дрэнна, фактычна не распачата праполка, ідзе дрэнна падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю. І вось таму, што мы, члены праўленьняў калгасаў, калгасныя брыгадзіры і дэлегаты 1-га раённага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў ня можам больш цярпець гэтага, мы зварочваемся да вас: давайце будзем моцна трымаць сувязь, давайце арганізуем сацыялістычнае спаборніцтва паміж нашым і вашым сельсаветам і паставім справу так, каб вашы прыклады, каб ваша работа нас падганяла, каб мы перасталі быць адстаючымі.

Мы можам і павінны быць адным з перадавых сельсаветаў Віцебскага раёну. Мы можам і павінны багацець і стаць заможнымі.

Мы ведаем нашы хваробныя зьявішчы, мы ведаем, што нашы ганебныя справы ў веснавой сяўбе—гэта справы кулацкія і тое, што мы ня далі ім належнага бою, тое, што мы далі магчымасьць кулакам у калгасах дзейнічаць ціхай сапай—пры належнай рэалізацыйнай калгаснай пільнасьці мы можам і павінны разграміць. Пад такім знакам, пад знакам ліквідацыі прарыву ў ворыве папару, пад знакам баявой падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю, да пастаўкі збожжа дзяржаве адразу-ж насьля першага абмалоту—мы жадаем спаборнічаць з вамі, сялюцкія калгасьнікі.

Давайце-ж сустрэнем 2-гі раённы і Усебеларускі зьлёты калгасьнікаў-ударнікаў перамогамі у барацьбе за выкананьне партыйна-урадавых заданьняў! Давайце-ж нашым спаборніцтвам дабіёмся агульнага ўздыму ня толькі нашых двох, але многіх сельскіх саветаў Віцебскага раёну! Давайце ж пабаявому будзем выконваць дырэктывы партыі і паказаньні нашага любімага правадыра тав. Сталіна, каб зрабіць калгасы бальшавіцкімі і нас калгасьнікаў, заможнымі.

Ад імя калгасаў Рудніцкага сельсавету:

(35 подпісаў).

Вытворчымі перамогамі сустракаем зьлёт.

ВІЦЕБСКІ СЕЛЬСАВЕТ, 28, (Па тэлефоне

Па ўсіх калгасах сельсавету разгорнута р бота па падрыхтоўцы да другога раённа зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў. Па калгасе ім Чырвонай арміі ў адказ на ліст калгасьніка калгасу „Малая Чэрніца" адрамантаваны ўвес ўборачны інвэнтар, прабаранавана 19 га бул бы. 27 чэрвеня пачалі касьбу балотнай сен жаці.

У калгасе імя 1 мая 25 чэрвеня скончы ворыва папару. Калгасьнікі абавязаліся в сходзе да 5 ліпеня выканаць гадавы пля здачы малака дзяржаве. У калгасе „Шлях д сацыялізму", узарана звыш плану 7 га п папару.

У калгасе «Іскра» скончана праполка збож жавых, праполана 15 га ячменю і 30 га аўс

Калгасу «Бальшавік» два месцы на зьлё прадастаўлена ўмоўна з прычыны таго, шт калгас ня выканаў плян падняцьця папару.

Сёньня ў сельсавеце склікаецца калгасн актыў разам з перадавымі аднаасобнікамі п пытаньні аб лепшай сустрэчы другога раённа га зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў.

Па калгасе імя 1 мая ўжо абраны дв дэлегаты. Лебедзеў Ільля—дэлегат першаг раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў—был конюх, а зараз працуе ў пававодчай брыгадзе ня мае ніводнага прагулу і ўдарна змагаўс за правядзеньне сяўбы і падняцьцё папару Брыгажава—калгасьніца гародняй брыгады, аб рана дэлегатам на другі раённы зьлёт калгась нікаў ударнікаў за ўдарную работу па пра полцы.

Рымы.

Ударная работа—права на зьлётаўскі мандат.

ЯЛАГІ, 28. (Па тэлефоне).

Учора адбылася нарада калгасьнікаў-ударнікаў—дэлегатаў першых раённага, усебелару кага і ўсесаюзнага зьлётаў і зьездаў калгасьні каў ударнікаў. Абмяркоўвалася пытаньне а падрыхтоўцы да другога раённага і ўсебелару кага зьлётаў калгасьнікаў-ударнікаў. Удзельні кі нарады абавязаліся ў застаўшыйся час д зьлётаў ліквідаваць прарывы ў дарбудаўніцтве лесавывазцы, па ўзносах па павыды „2-й пя цігодкі" а таксама ліквідаваць прарыў у пад няцьці папару па калгасе «Капачова».

На нарадзе створана камісія ў складзе старшыні сельсавету Паўлючэнка, дэлегата пер шага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-удар нікаў Лысенка і агранома Камянецкага, якой даручана кіраўніцтва і праверка ходу падры хтоўкі калгасаў да другога раённага зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў. 30 чэрвеня на прэзы дыуме сельсавету гэтая камісія абавязана будзе падвесьці вынікі ходу падрыхтоўкі і ў залеж насьці ад выкананьня калгасамі дырэктыў аб падняцьці папару, праполцы і падрыхтоўцы да ўборкі будуць разьвёрстаны месцы паміж калгасамі на другі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў.

Увесь актыў сельсавету мабілізаваны на прапрацоўку ў калгасах ліста ўдзельнікаў вытворчай нарады калгасу „М. Чэрніца", якая сёньня праводзіцца ва ўсіх калгасах.

Новікаў.

Тут бязьдзейнічаюць.

СТАРАЕ СЯЛО, 28. (Па тэлефоне).

Падрыхтоўка да зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў яшчэ не распачата. Ні партыйная ячэйка, ні сельсавет гэтага пытаньня не абгаварвалі. Апублікаваны ў «Віцебскім пралетары» ліст калгасу «Малая Чэрніца» ні ў адным калгасе яшчэ не прапрацоўваўся.

Грынман.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА РАЁННАГА КАЛГАСНАГА КІРМАШУ.

АБ АРГАНІЗАЦЫІ РАЁННАГА КАЛГАСНАГА КІРМАШУ.

Пастанова прэзыдыуму гарсавету ад 27 чэрвеня 1933 г.

1. У мэтах далейшага разгортваньня савецка-калгаснага гандлю, узмацненьня тавараабароту паміж горадам і вёскай і паляпшэньня рабочага снабжэньня правесьці 2 і 3 ліпеня г. г. раённы калгасны кірмаш.

2. Абавязаць усе гандлюючыя і каапэрацыйныя арганізацыі гораду забясьпечыць арганізаваны ўдзел у кірмашы. Мэтай правядзеньня кірмашу павінна быць як больш рэалізаваць прамтавараў, для чаго ўсе гандлюючыя арганізацыі павінны выкінуць максымум тавараў шырспажыву, на належачыя тавары зрабіць пераацэнку згодна ўказаньняў вышэйстаячых арганізацый—БКС і Белгандлю. У час кірмашу павінны быць адчынены ўсе ларкі, а таксама дадаткова адчынены на трох кірмашах 20 палатак.

3. Абавязаць загадчыка каапрамонту арганізаваць па адной пачынчай мастэрні на кожным рынку для абслугоўваньня калгасьнікаў.

4. Даручыць тав. Гіцовічу адчыніць па адной гарбатні на кожным рынку для абслугоўваньня калгасьнікаў.

5. Прапанаваць старшыням сельсаветаў і ўпаўнаважаным гарсавету правесьці спэцыяльнае пасяджэньне праўленьняў калгасаў і агульныя сходы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў па пытаньнях удзелу калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў у кірмашы і вывазу сельгаспрадуктаў на калгасныя рынкі, вызначыўшы колькі кожны калгас і кожны калгасьнік можа вывезьці сельгаспрадуктаў. Разам з гэтым гарсавет папярэджвае, што вываз сельгаспрадуктаў ні ў якім разе не павінен адбіцца на выкананьні дзяржаўных заданьняў. Арганізацыя раённага кірмашу і падрыхтоўка да яго павінны праводзіцца пад пунктам гледжаньня далейшага разгортваньня калгаснага гандлю і арганізаванага вывазу сельгаспрадуктаў на калгасныя рынкі.

6. Абавязаць прадпрыемствы выслаць прадстаўнікоў у падшэфныя калгасы для арганізацыі вывазу сельгаспрадуктаў і ўдзелу калгасьнікаў у кірмашы.

7. Адказнасьць за падрыхтоўку і правядзеньне раённага кірмашу ўскласьці на тт. Моіна і Шпілёва.

Старшыня гарсавету Кардашэнка.

ЧЫСТКА І ПРАВЕРКА РАДОЎ ПАРТЫІ.

АЧЫСЬЦІЦЬ ВЯСКОВУЮ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ АД ПЕРАРАДЖЭНЦАЎ І ПАСОБНІКАЎ КЛЯСАВАГА ВОРАГА.

Курс—на ліквідацыю ганебных прарываў.

Аб тым, што Даўжанская парт'ячэйка знаходзіцца ў палоне апартуністычнага самацёку, што апартуністычныя разважаньні і справы старшынь калгасаў і брыгадзіраў паляводчых брыгад-камуністаў калгасаў «Інтэрнацыянал», «Сілач» і «Новы шлях» зрываюць выкананьне гаспадарча-палітычных задач на вёсцы, мы пісалі яшчэ 6 мая.

Мы неаднакроць сыгналізавалі аб зрыве сяўбы, аб зрыве папаравай і праполачнай кампаній з боку перараджэнцаў і аб гніла лібэральных адносінах да зрыўшчыкаў выкананьня важнейшых рашэньняў партыі з боку бюро парт'ячэйкі і асабіста сэкратэра ячэйкі Гарадзецкага.

Цяпер калі пачалася чыстка ячэйкі, прыходзіцца канстатаваць, што яна яшчэ і дагэтуль знаходзіцца ў палоне апартуністычнага самацёку, што яна яшчэ не аслабанілася ад перараджэнцаў і «шляп».

Да сёньняшняга дню ў радах партыі знаходзіцца брыгадзір гародняй брыгады калгасу «Інтэрнацыянал» Котаў. Той самы Котаў, які ня толькі не забясьпечыў працоўную дысцыпліну ў сваёй брыгадзе, але і сам ня выходзіў на работу ў рэлігійныя сьвяты, які толькі нядаўна, калі быў самы разгар сяўбы ў Даўжанскім сельсавеце, кінуў брыгаду і паехаў у горад. Як гэты, з дазволу сказаць, «камуніст» можа змагацца за ўстанаўленьне працоўнай дысцыпліны ў сваёй брыгадзе, калі ён сам лодырнічае?

Партыйная ячэйка ня прыняла ніякіх рашучых мер для аздараўленьня і ўмацаваньня калгасаў „Сілач" і „Інтэрнацыянал". У гэтых калгасах яшчэ засталіся да сёньняшняга дню незасеяныя дзесяткі га гародніх і сілосных культур. Тут яшчэ не прыступілі да праполкі.

На чале 3-й брыгады калгасу „Інтэрнацыянал" да сёньняшняга дню стаіць яўны сабатажнік, укрывацель лодыраў і прагульшчыкаў Тамашоў. Гэты Тамашоў укрыў ад калгаснай грамадзкасьці «калгасьніка» Грабянцова, былога заможніка, які 11 дзён пад рад ня выходзіў на работу. Гэты самы Тамашоў сарваў выхад брыгады на лесазагатоўкі, зрывае папаравую кампанію. Ці не гавораць гэтыя факты, што тыя вялікія зрывы, якія наглядаюцца ў калгасе, зьяўляюцца вынікам таго, што кіраўнікі цацкаюцца, лібэральнічаюць з кулацкімі агентамі?

Старшыня калгасу «Сілач» камуніст Якубенка, як мы пісалі раней, у пачатку сяўбы голасна заяўляў, што правядзе сяўбу толькі у 2—3 месяцы. Аб дрэнным кіраўніцтве калгасу «Сілач» адзначаў ліст сельскораў гэтага калгасу, зьмешчанага ў «Віцебскім пралетары» 21 мая. Неаднакроць адзначала з рук вон дрэннае кіраўніцтва калгаса пасьценная газэта. Усе гэтыя сыгналы засталіся без належнага рэагаваньня з боку партыйнай ячэйкі.

Бюро партыйнай ячэйкі чакала пакуль Якубенка канчаткова не праваліў сяўбу, ня даўшы яму за ўвесь час ніякіх партспагнаньняў. Толькі 22 мая ён быў выключаны з партыі і адданы пад суд. Замест Якубенка, парт'ячэйка рэкамэндуе старшынёй калгасу Махавікова, які зьяўляючыся брыгадзірам першай брыгады, з работай не справіўся, які, зьяўляючыся ў мінулым годзе намесьнікам старшыні калгасу дапусьціў разбурэньне калгасу клясава варожымі элемэнтамі, схуданьне конскага пагалоўя, застаўленьне на лугах калгасу тысячы цэнтнераў сена..

З боку камуніста, старшыні калгасу «Шлях Ільліча» Багданава Данілы наглядаліся яўнаспэкуляцыйныя тэндэнцыі Так, маючы лішкі рассады, ён згадзіўся прадаваць яе калгасу «Новы шлях» толькі, па рыначных цэнах.

Старшыня-ж калгасу „Новы шлях" камуніст Багданаў Іван яшчэ больш выявіў свае дробна ўласьніцкія месьніцкія тэндэнцыі пры перакідцы насеньня ў іншыя калгасы. Маючы лішкі бульбы і вікі, ён іх захоўваў, ніяк не згаджаўся перакінуць іх ў. калгас „Сілач", якому не хапала гэтага насеньня.

Ячэйка КП(б)Б зусім не займалася работай сельСТ. Апошняе мае вялізарны прарыў у сваёй рабоце. СельСТ не паставіла сваю работу на службу веснавой сяўбы, а зараз праполачнай. За апошнія чатыры месяцы сельСТ, быў арганізаваны адзін выезд у калгасы у поле. Старшыня сельСТ камуніст Крыўцоў праяўляе коснасьць і непаваротлівасьць. Дарэчы кажучы, Крыўцоў, калі быў прымацаваны да калгасу «Новы шлях», не мабілізаваў калгаснікаў на сканчэньне сяўбы ў вызначаныя тэрміны і дапусьціў зацягваньне сяўбы да дваццатых лічбаў чэрвеня.

Галоўным недахопам Даўжанскай парт'ячэйкі зьяўляецца адсутнасьць масавасьці. Ячэйка адарвана ад беспартыйнага калгаснага актыву, ня выхоўвае гэты актыў. На сходах парт'ячэйкі прысутнічаюць адзінкі беспартыйных. На апошніх сходах беспартыйныя зусім адсутнічалі.

Вельмі характэрны факт. Сходы парт'ячэйкі адбываліся заўсёды ў памяшканьні сельсавету. У гэтай акалічнасьці бюро парт'ячэйкі бачыла прычыну таго, што на сходах адсутнічаюць беспартыйныя. Што-ж зробілі? Перанесьлі сход у калгасе „Сілач". Можна было чакаць, што на сходзе будзе прыцягнута маса калгаснікаў, але «вызны» сход адбыўся пры ўдзеле... аднаго беспартыйнага. Гэта—вынік адсутнасьці масава-палітычнай работы сярод калгаснікаў і ў першую чаргу сярод актыва.

Чыстка партыйнай ячэйкі павінна стаць тым вагаром, які-бы ўзьняў работу ячэйкі, які мабілізаваў бы камуністаў і калгасны актыў на ліквідацыю глыбачэйшых прарываў, у якім, апынуўся Даўжанскі сельсавет.

Памятаючы указаньні нашага правадыра аб ролі камуністаў у кіраўніцтве вёскай, памятаючы, што „калі гутарка ідзе аб адказнасьці і вінаватасьці, дык адказнасьць падае цалкам і поўнасьцю на камуністаў..." (Сталін), ачышчаючыся ад кулацкіх перараджэнцаў і апартуністаў, партыйная ячэйка павінна зараз-жа ўзяць курс на перакожны шлях выхаду з прарываў.

І. Казанскі.

ПРАПРАЦАВАЛІ ПАСТАНОВУ І... „СУПАКОІЛІСЯ".

Падрыхтоўка да чысткі партыі ў Рудакоўскай ячэйцы не разгорнута. Ячэйка на чале з сэкратаром Мінаковым пасьля распрацоўкі на партыйным сходзе пастановы ЦК і ЦКК аб чыстцы партыі супакоілася.

Вучоба не пачата. Літаратура аб чыстцы партыі, прысланая гаркомам, ляжыць зьвязаная ў шафе. А камуністы з Рудакоў вельмі слаба палітычна адукаваны. Ня гледзячы на гэта, ніхто з іх не займаецца, нават многія ня чытаюць «Праўды» і „Зьвязды".

Ніколькі ня дзіўна, што Рудакі ўвесь час ва ўсіх кампаніях адстаюць. І ня дзіўна, што камуністы, як Кароткін, Калатоўкін, Крупко, Зайцаў ня ведаюць якую ролю павінны адыграць камуністы ў брыгадзе і як камуніст павінен арганізоўваць масы на барацьбу за выкананьне плянаў сяўбы, ворыва папару, праполкі і падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Партыйная ячэйка ня выхоўвае сваіх членаў.

Шэфы—фабрыка «Прафінтэрн», Саюзтранс і 22-і групком саюзу будаўнікоў не дапамагаюць камуністам сваіх падшэфных калгасаў рыхтавацца да чысткі партыі.

Вывады? Партыйная ячэйка абавязана зараз-жа разгарнуць вучобу, выцягнуць літаратуру з шафаў, каб даць яе камуністам, мабілізаваць масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на сканчэньне ворыва папару, першай праполкі, падрыхтоўкі да ўборкі.

Сурганаў.

Кожны непраполаны га—удар па рабочым снабжэньні

АПЭРАЦЫЙНЫ ЎЛІК—ХОДУ ПРАПОЛАЧНАЙ КАМПАНІІ Ў КААПГАСАХ

ГарЗА І ГАРПРАФСАВЕТ НЯ ВЕДАЮЦЬ ЯК ІДЗЕ ПРАПОЛКА НА ГАРОДАХ

„ВУЧОТЧЫКІ" З ГАРЗА.

Мы ўжо выступалі па пытаньні, як гарЗА кіруе каапгасамі. У прыватнасьці гаварылі, што ня могуць ніяк арганізаваць вучот ходу праполачнай кампаніі. На сёньняшні дзень становішча з вучотам па праполачнай кампаніі ў каапгасах не зьмянілася.

ГарЗА пачаў складаць зводкі ў процівагу пастанове ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 16 чэрвеня. Гэта значыць, што ў зводцы адсутнічаюць лічбы работ па ўспушэньні, акучваньні і г. д. Вось, прыкладна, у зводцы гарЗА, складзенай на 26 чэрвеня, адзначана, што каапгас „Сьцяг індустрыялізацыі" прапалоў 17 га. З чаго бяруць яны гэту лічбу? Аказваецца, што конная праполка па каапгасу складае 15 га, а ручная 2 га. І работнікі гарЗА бяруць і складваюць 15 і 2 і атрымліваецца 17 га. Хіба гэта ёсьць дасканалы вучот зьнішчэньня пустазельля ў гародах? Гэта--простае ашуканства, блытаніна. І яшчэ адна акалічнасьць: гар чамусьці вызначае плянны праполкі: прыклад каапгас фабрыкі імя Цёткін павінен пр лоць 25 га. Гэта ў корані наверна, на са справе трэба прапалоць значна больш. Та ўстаноўкі гарЗА,—гэта простае шкодніцтва, што мы і зьвяртаем увагу прэзыдыуму гар вета.

Таксама і гарпрафсавет не займаецца арг нізаваным вучоту. Толькі ўчора ў гарпрафса це заварушыліся, пачалі самі складаць вод не чакаючы паведамленьняў з гарЗА.

Гарпрафсавет, у першую чаргу гарЗА п вінны неадкладна наладзіць вучот праполкі прыгарадных гаспадарках паводле рашэньн ЦК УсеКП(б) і СНК СССР. Аўтары ж шкодн віх установак павінны быць прыцягнуты суровай адказнасьці.

Пакласьці канец злачыннай расхлябанасьці.

25 чэрвеня быў апошні тэрмін першай праполкі гародніны, а каапгас „Білева" яшчэ не зрабіў і палову гэтай работы. А магчымасьці былі! Дзе прычыны? Чым тлумачыцца такая непаваротлівасьць? Вось чым.

Адчуваецца самазаспакаеньне, асабліва за апошнія дні. Належнай расстаноўкі рабочай сілы на палёх няма; брыгадзіры Пінцоў, Булкін сядзяць у канторы, ніхто з іх не займаўся ўвядзеньнем індывідуальнай зьдзельшчыны. Работу гарадзкіх рабочых улічвалі агулам, а таму і атрымліваецца, што 58 жанчын выпрацавалі толькі 12 проц. нормы. Прыкладныя рабочыя, як работніца Харошая (сталоўка № 8) і інш., якія больш за ўсіх выконваюць дадзенае заданьне, чамусьці лічацца на роўні з адстаючымі. Абязьлічка не дабіта: брыгадзіры паміж сабою вучасткаў не разьмяркавалі і бываюць дні, калі па адным месцы пройдуць усе брыгадзіры, а калі і нікога.

Неабходна пакласьці канец той безадказнасьці, злачыннай расхлябанасьці ў каапгасе «Білева», якая зрывае ўсю работу.

Рабкораўскі пост газэты „В. П". Шастакоў.

ЧОРНЫ СЬПІС

КААПГАСАЎ, ЯКІЯ ПРАВАЛЬВАЮЦ ПРАПОЛКУ.

КААПГАС АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ.

Дырэктар Баярунас. Трыкутнік фабры Галуза, Цап, Галандцаў.

КААПГАС МОПР ФАБРЫКІ „ДЗЬВІНА".

Дырэктар Шыльнікаў. Трыкутнік фабры Каплан, Вэксьлер, Собалева.

КААПГАС ЛЕСАШЛЬНАГА І ФАНЭРНАГА ЗАВОДУ.

Дырэктар Баранаў. Трыкутнікі завод Шапіра, Шафранаў, Клубнікаў, Мальчы Алешка, Мількін.

КААПГАС—«ЦЕРАСПОЛЬ».

Дырэктар Землякоў. Старшыня ТСТ К

КААПГАС „БІЛЕВА".

Дырэктар Ахрамейка. Старшыня праўлен ЦРК Гіцовіч.

РАГОЖНЫ СЬЦЯГ ЗАСТАЕЦЦА Ў КААПГАСЕ „САКОЛЬНІКІ".

Рагожны сьцяг, уручаны ў час сяўбы каапгасу „Сакольнікі" пачэшнай фабрыкі Цёткін, пакідаецца ў каапгасе за чарнашы тэмпы ў праполцы.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ.

30-га чэрвеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у клюбе гаркому КП(б)Б адбудзецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПРАПАГАНДЫСТАЎ.

Абвестка дня: Аб чыстцы партыі. Дакл.—т. Пасюкевіч.

Сэкратарам ячэек забясьпечыць яўку, аслабаніўшы прапагандыстаў ад прысутнасьці на сходах па чыстцы.

Культпроп ГК КП(б)Б.

— 30 чэрвеня, а 10 гадзіне раніцы і а 6 гадзіне увечары, адбудзецца

ГАРАДЗКІ КАМСАМОЛЬСКІ ПАЛІТБОЙ

па нацыянальным пытаньні.

Пад адказнасьць сэкратароў прапануецца забясьпечыць вызначаную колькасьць удзельнікаў і сваячасовую яўку ў паказаныя пункты.

Пасьля палітбою—мастацкая частка.

Гаркам ЛКСМБ.

— Віцебску прадстаўлена ў Маскоўскай ВКСГШ імя Сьвярдлова на 2-гадовае адзяленьне 1 месца, 3-гадовае—2 месцы, у Ленінградзкім ВКСГШ імя Сталіна на 3-гадовае адзяленьне—2 месцы.

Правілы прыёму апублікаваны ў газэце „Известия" за 16 чэрвеня 1933 г. Жадаючыя паступіць на вучобу павінны прадставіць у Культпроп ГК не пазьней 2 ліпеня заяву, засьведчаны кароткі ўласнаручны ліст, партхарактарыстыку, водгук аб рабоце.

Культпроп Гаркому КП(б)Б.

— Сёньня, 29 чэрвеня, а 7 гадз. увечар у клюбе фабрыкі імя Цёткін адбудзецца нара гаспадарнікаў прадпрыемстваў лёгкай прам словасьці з удзелам прафсаюзных арганізац па пытаньні аб структуры кіраўніцтва пр прыемства.

Яўка гаспадарнікаў і зацікаўленых суп цоўнікаў прадпрыемстваў абавязкова. Зап шаюцца прадстаўнікі прафсаюзных арганізац і фабрычна-заводзкі актыў.

30 чэрвеня а 6-й гадз. увечары, у Д Камасьветы адбудуцца чарговыя заняткі тр кутнікаў прадпрыемстваў. Тэма „Барацьба два фронты—закон разьвіцьця нашай партыі Лектар т. Рабіновіч.

Запрашаюцца прапагандысты.

Культпроп гаркому КП(б)Б.

— Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары, доме Камасьветы будзе прачытана лекцыя выкладчыкаў і прапагандыстаў на тэму: «ноўныя пытаньні гісторыі КП(б)Б». Лек тав. Поташ.

Запрашаецца кіруючы партактыў гораду.

Культпроп ГК КП(б)Б.

Ад народнага камісарыяту па замежных справах.

21 чэрвеня г. г. Японскі пасол у Маскве п. Ота наведаў намесьніка Народнага Камісара па Замежных Справах т. Г. Я. Сакольнікава і паведаміў яму, што па маючыяся ў распараджэньні Японскага Ўраду вестках, у раёне мыса Краноцкага на Камчатцы тры рыбакі з японскага рыбалоўнага катэру «Фумі-Мару», якія накіроўваліся ў лодцы да берага за піцьцявой вадой, былі, быццам абстрэлены з сухазем'я ружэйным агнём; катэр „Фумі Мару", па гэтых зьвестках, таксама падвергся абстрэлу і ўдаліўся, пакінуўшы сваю лодку з трыма рыбакамі, якія, па далейшай інфармацыі, атрыманай Японскім Урадам, паказаным ружэйным агнём, быццам былі забіты. Японскі пасол п. Ота заявіў, што мае ад свайго ўраду даручэньне заявіць пратэст з поводу памянёнага здарэньня, і паведаміў, што пакідае за сабою права прадзявіць трэбаваньне аб пакараньні адказных па гэтай справе асоб і аб аплаце пацярпеўшым. Разам з тым Японскі пасол п. Ота прасіў дазволіць сэкратару японскага консульства ў Пятропаўлаўску на Камчатцы выехаць на мінаносцы „Тацыказе", які знаходзіцца ў раёне Камчаткі, да месца здарэньня для высьвятленьня факту здарэньня і яго абставін.

Нам. Наркому па Замежных Справах тав. Г. Я. Сакольнікаў заявіў ад імя Савецкага Ўраду Японскаму паслу, што Савецкі Ўрад у даны момант не распалагае ніякай інфармацыяй аб гэтым здарэньні, але што калі зьвесткі, паведамленыя п-ам Ота, пацьвердзяцца, то вінаватыя панясуць належнае пакараньне. Адхіліўшы прапанову аб паездцы сэкратара японскага консульства п. Ногучы на ваенным судне, тав. Г. Я. Сакольнікаў выразіў згоду на зробленую п. Ота прапанову дазволіць паездку п. Ногучы на грамадзянскім судне „Кінсі-Мару".

Адначасова савецкім мясцовым органам былі зроблены распараджэньні аб безадкладным вытварэньні расьледваньня на месцы з мэтай устанаўленьня факту здарэньня і яго абстаноўкі, у выпадку пацьвярджэньня самага факту. Такім чынам, у перагаворах Японскага пасла п. Ота з намесьнікам Народнага Камісара па Замежных Справах т. Г. Я. Сакольнікавым абодвымі бакамі быў узгоднён намечаны нармальны шлях да высьвятленьня і ліквідацыі ўзьнятага Японскім Урадам пытаньня.

Аднак, у далейшым выявілася, што мінаносец „Тацыказе", не чакаючы вытварэньня расьледваньня савецкімі прадстаўнікамі і паездкі п. Ногучы, прадпрыняў незаконныя крокі ў раёне здарэньня, а іменна пранік у савецкія тэрытарыяльныя воды і высадзіў на савецкую тэрыторыю частку каманды, якая ў самачынным парадку абсьледвала бераг.

З поводу гэтых фактаў Нам. Народнага Камісара т. Г. Я Сакольнікаў меў 26 чэрвеня новую гутарку з Японскім паслом п Ота, у ходзе якой уручыў яму ніжэйнаступную заяву:

Заява намесьніка Наркамзамспраў т. Г. Я. Сакольнікава японскаму паслу п. ОТА ад 26 чэрвеня г. г.

«У сувязі з заявай, якую п. Ота ад імя Японскага Ўраду зрабіў НКЗС па поводу здарэньня, мешчага месца, па зьвестках Японскага Ўраду, у раёне мыса Краноцкага з трыма японскімі рыбакамі. Савецкі Ўрад паведамляе, што па наведзеных папярэдніх справах, у раёне мыса Краноцкага, які прадстаўляе пустынную мясцовасьць, паста савецкай прымежнай аховы ня маецца і пагэтаму паведамленьне аб інцыдэнце выклікае ў яго крайняе недаўменьне. Ніякіх зьвестак, пацьвярджаючых здарэньне і малюючых яго абстаноўку, у сучасны момант у распараджэньні Савецкага Ўраду ня маецца. Калі далейшае расьледваньне пацьвердзіць факты, паведамленыя п. Ота і ўстановіць віноўнасьць яміх-небудзь савецкіх служачых, яны напэўна панясуць належнае пакараньне. Аднак, у даны момант увесь інцыдэнт застаецца для Савецкага Ўраду зусім ня высьветленым.

Савецкі Ўрад, разам з тым лічыць неабходным заявіць рашучы пратэст супроць дзеяньняў Японскага мінаносца «Тацыказе», які зайшоў без дазволу ў савецкія тэрытарыяльныя воды ў раёне мыса Краноцкага, высадзіў на бераг частку каманды і вытвараў самачынныя дзеяньні па расьледваньні здарэньня з трыма рыбакамі, аб якім 21 чэрвеня японскае пасольства ў Маскве давало да ведама НКЗС. Гэтыя дзеяньні японскага ваеннага судна прадстаўляюць сабой абураючае парушэньне пясрочных і катэгарычных прававых нормаў. Разам з тым яны ў вялізарнай ступені затрудзнілі для савецкіх органаў, якім даручана расьледваньне, устанаўленьня факту здарэньня з трыма рыбакамі і высьвятленьне абставін гэтага здарэньня, калі яно сапраўды мела месца.

Савецкі Ўрад ня можа ня выказаць крайняга недаўменьня па поводу абвяржэньня факту заходу японскага мінаносца ў савецкія воды, зробленага дырэктарам Эўрапэйска-Азіяцкага Дэпартамэнту Міністэрства Замежных Спраў Японіі п. Того Саветніку Ўпаўнаважанага прадстаўніцтва СССР у Японіі п. Сьпільванку 20 чэрвеня. Яшчэ большае недаўменьне выклікае поўная неадпаведнасьць ісьціне заява, зробленая Загадчыкам Бюро Друку Міністэрства Замежных Спраў Японіі п. Амо прадстаўнікам замежнага друку 23 чэрвеня аб тым, што быццам японскае пасольства ў Маскве паведаміла НКЗС 21 чэрвеня аб факце заходу мінаносца ў савецкія воды. Савецкі урад не атрымаў ад японскага пасольства ў Маскве паведамленьня падобнага роду і толькі з камунікэ п. Амо даведаўся аб незаконамерных дзеяньнях японскага мінаносца „Тацыказе", па поводу якіх яно заяўляе японскаму ўраду гэты пратэст».

СТАН АБЛОГІ Ў СТАЛІЦЫ БАЛГАРЫІ.

ПАРЫЖ. З прычыны адсутнічаньня прамога паведамленьня з Балгарыяй „Пти Парызьен" зьмяшчае наступную тэлеграму з Белграду ад 25 чэрвеня.

«А 3 гадзіне раніцы ў Сафіі (сталіца Балгарыі) абвешчаны абложны стан. Войскі і паліцыя ахоўваюць усе вуліцы Насельніцтву забаронена выходзіць на вуліцу: Ва ўсіх дамох вытвараюцца вобыскі. Узброеныя вайсковыя часьці арыштоўваюць усіх падазроных асоб. Абложны стан уведзены да 19 гадзін 30 чэрвеня. Вуліцы зусім пустыя, Па ім ціркулююць толькі жандары. Замежныя карэспандэнты пазбаўлены магчымасьці даваць паведамленьні таму, што тэлеграфная і тэлефонная сувязь прарвана з усімі краінамі. Уся ўлада ў руках арміі. Толькі вайсковае міністэрства аддае распараджэньне. Здарэньні ствараюць такое ж ураджаньне, як здарэньні ў чэрвені 1923 году, калі быў забіты Стамбулійскі»

Францускі друк тлумачыць гэтыя здарэньні дзейнасьцю македонскіх тэррарыстычных арганізацый.

Адкрыцьце перагавораў у Токіё.

ТОКІЁ. 26 чэрвеня, а 14 гадзіне, у Токіё, у афіцыяльнай рэзыдэнцыі таварыша міністра Замежных Спраў, адбылося адкрыцьцё канфэрэнцыі па перагаворам аб продажу КУЧ. На адкрыцьці канфэрэнцыі прысутнічалі: японскі міністр Замежных Спраў Уцыда, тав. міністра Замежных Спраў Сігеміцу, начальнік эўрапэйскага і амэрыканскага аддзелаў міністэрства Замежных Спраў Того, начальнік рускага аддзелу міністэрства Замежных Спраў Нісі і падпалкоўнік Муратані (часова замяняючы прадстаўніка вайсковага міністэрства на канфэрэнцыі палкоўніка Сузукі). З савецкай краіны прысутнічалі тт.: Юрэняў, Казлоўскі, Кузьняцоў; дэлегацыя Манчжоу-Го была прадстаўлена Дзін Шы-юанем і Охасі.

Канфэрэнцыя адкрылася прамовай Уцыда, які прывітаў ад імя японскага ўраду ўдзельнікаў канфэрэнцыі. Потым з прамовай выступілі тав. Юрэняў і Дзін Шы-юань. Па сканчэньні прамоў Уцыда, Сігеміцу і Того пакінулі залю насяджэньня, пасьля чаго пачалося першае дзелавое насяджэньне канфэрэнцыі, якая абгаварвала працэдурныя і пратакольныя пытаньні.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

Апошнія 2 гастролі расійскай драмы.

Сёньня, 29 чэрвеня у апошні раз

ЕГОР БУЛЫЧЕВ А. М. Горкага.

30 чэрвеня

КОВАРСТВО И ЛЮБОВЬ

Шылера.

Пачатак а 8 гадз. 30 мін. Білеты прадаюцца ў касе тэатру.

Гарбюро ДКО і гарснаб паведамляюць усіх бацькоў, дзеці якіх знаходзяцца ў піянэрскіх лягерах **аб неабходнасьці зьняцьця дзяцей са снабжэньня на ліпень месяц**, вылічыўшы 28 дзён у лягерах і 35 дзён у доме адпачынку з дня выезду. Даведкі аб зьняцьці з вучоту неабходна прынесьці ў гарбюро ДКО да 30 чэрвеня (з 9 гадз. раніцы да 2-х гадз. кожны дзень). Дзеці бацькоў, не прадставіўшых даведкі, будуць адасланы дамоў.

581—2—2

ТРЫМАЦЕЛЯМ АВАНСАВЫХ ОРДЭРАЎ ВЦРК.

УСЕ АВАНСАВЫЯ ОРДЭРЫ АТАВАРВАЮЦЦА ДА 1 ЛІПЕНЯ праз краму № 120, якая знаходзіцца на рагу Вагзальнай і Канатнай вул., дзе маецца вялікі выбар розных прамтавараў, як та: галёшы, мануфактура, гатовае адзеньне і інш

З 1 ЛІПЕНЯ 1933 г. ВЫДАЧА ТАВАРАЎ БУДЗЕ СПЫНЕНА і трымацелям ордэраў, якія не атрымалі тавары бяз уважлівых прычын, БУДЗЕ ВЫПЛАЧАНА ЎНЕСЕНАЯ СУМА ГРОШАЙ.

584—2—1

Даводзіцца да ведама, што ЛАЗЬНІ ПРАЦУЮЦЬ кожны АЎТОРАК, СЕРАДУ, ЧАЦЬВЕР, ПЯТНІЦУ І СУБОТУ з 12 да 21 гадзіны. Скрынкі для адзеньня пасьля кожнага наведвальніка дэзынфіцыруюцца.

580—3—1 КАМГАС.

ПРАПАНУЕЦЦА ЎСІМ УСТАНОВАМ, ПРАДПРЫЕМСТВАМ, якія заключылі ўмо з Віцебскай канторай Саюзтрансу на быт рэньне транспартна-экспэдыцыйных апэр цый, ПРАДСТАВІЦЬ САЮЗТРАНСУ Н ПАЗЬНЕЙ 30 ЧЭРВЕНЯ г. г ЗЬВЕСТКІ А ГРУЗАЗВАРОЦЕ НА ПЭРЫЯД АСЕНЬНЯ ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК З 1 ЖНІЎНЯ П 31 СЬНЕЖНЯ 1933 г. ПААСОБКУ ЗА КОЖНЫ МЕСЯЦ па прыбыцьці і адпраўленьні пералічэньнем роду грузаў на чыгунцы прыстані.

Установы і прадпрыемствы, якія н прадставяць паказаных зьвестак, будуць пазбаўлены права карыстацца аўта-гужтрас спартам на пэрыяд асеньня зімовых перавозак.

569—3—

ВІЦЕБСКАЯ ШКОЛА ФЗВ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ ПРЫ ФАБРЫЦЫ «ДЗЬВІНА» абвяшчае **АСЕНЬНІ НАБОР** вучняў. Прымаюцца вучні з ведамі на базе 5—7 груп, 1916, 17 і 18 г. г нараджэньня, пераважна дзяўчаты. Для паступленьня неабходна прадставіць метрыку, даведку аб адукацыі і санстаноўвішчы. Залічаныя ў школу вучні ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЦА СТЫПЭНДЫЯЙ, ІНТЭРНАТАМ, ЧАСТКОВА ПАСЬЦЕЛЬНЫМІ ПРЫЛАДАМІ, СТАЛОЎКАЙ. СНАБЖАЮЦЦА ВУЧНІ ПА 1-Й КАТЭГОРЫІ.

Заявы прымаюцца ДА 15 ЖНІЎНЯ ў канцылярыі школы (Пралетарская слабада, ФЗВ „Дзьвіна").

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Віцебск Г № 12. Друкарня „Камінтэрн", Бальшавіцкая, 10